**А. Пыталь**

# АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЕКТНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПАДЛЕТКАЎ У АДУКАЦЫЙНЫМ ПРАЦЭСЕ

Дзейсным сродкам рэалізацыі сацыяльнага заказу па падрыхтоўцы навучэнцаў да рэальнага жыцця з'яўляецца праектнае навучанне, якое спрыяе развіццю пазнавальных навыкаў, крытычнага мыслення, уменняў арыентавацца ў інфармацыйнай прасторы і самастойна канструяваць веды для вырашэння праблем, якія ўзнікаюць непасрэдна ў жыцці.

Значную ролю праектная дзейнасць набывае ў падлеткавым узросце, калі адбываецца станаўленне самасвядомасці асобы. Падлеткі, занятыя самавывучэннем і самасцвярджэннем у асяроддзі аднагодкаў, жадаюць больш высокага ўзроўню аўтаноміі ў адносінах з дарослымі, імкнуцца дасягнуць поспеху ў розных відах сацыяльна-значнай дзейнасці, у якіх магчыма самавызначэнне. Ва ўмовах традыцыйнага навучання падлетак часцей за ўсё не адчувае сябе суб'ектам вучэбнай працы, а таму вучоба, як правіла, не ўваходзіць у гэта кола.

Змяніць становішча дапамагае арганізацыя праектнай работы, пад якой мы разумеем практычную дзейнасць падлетка, дзе новыя спосабы дзейнасці ператвараюцца ў сродкі рашэння самастойна пастаўленай практыка-арыентаванай задачы, а меркай паспяховасці праекта з'яўляецца яго прадукт. Пры гэтым падлетак усталёўвае сувязь сваёй задумы з яго рэалізацыяй, мадэлюе рэчаіснасць, эксперыментуе з ёй, выяўляе сувязь сваіх дзеянняў з уласнымі пачуццямі і перажываннямі.

Арганізацыя праектнай дзейнасці ў падлеткавым узросце забяспечвае фарміраванне ключавых кампетэнцый – комплексных уласцівасцей асобы, якія ўключаюць ўзаемазвязаныя веды, уменні, каштоўнасці, а таксама гатоўнасць мабілізаваць іх у неабходнай сітуацыі, дзе спатрэбіцца іх практычнае выкарыстанне, і складаецца з наступных стадый:

- выяўленне актуальнай патрэбы ў нечым і пастаноўка практычнай праблемы – стадыя праблематызацыі;
- пошук спосабу вырашэння праблемы – стадыя праектавання рашэння;
- планаванне дасягнення жаданага выніку – стадыя планавання дзеянняў;
- практычная рэалізацыя праекта – стадыя выканання;
- завяршэнне праекта – стадыя падвядзення вынікаў і рэфлексіі.

Выкарыстанне ў адукацыйным працэсе праектных задач спрыяе станаўленню навучальнага супрацоўніцтва суб'ектаў адукацыйнага працэсу; прымяненню вядомых спосабаў дзеяння ў нестандартнай сітуацыі; глыбокаму аналізу вынікаў маніторынгу навучальнага працэсу; фарміраванню асобы, здольнай да развіцця і сатворчасці, выхаванню пачуцця адказнасці за вынікі працы.